Таким образом, Турецкая Республика создала систему государственных учреждений, которые формируют основные принципы внешней культурной политики и отвечают за реализацию широкого круга международных культурных проектов. Национальная модель характеризуется централизацией.

Государственные структуры выступают инициаторами масштабных культурных программ, рассчитанных на длительный период. Культурное сотрудничество осуществляется посредством деятельности национальных учреждений за рубежом. Общественные организации (Фонды) являются в большей степени частно-государственными.

## ДА ПЫТАННЯ АБ РЭКАНСТРУКЦЫІ ПРЫЁМУ ПАСЛОЎ У ВЯЛІКІМ КНЯСТВЕ ЛІТОЎСКІМ СЯРЭДЗІНЫ XVI ст.

***Янушкевіч А. М.**, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

Рэканструкцыя пасольскага абраду ў Вялікім Княстве Літоўскім яшчэ не рабілася ў гістарыяграфіі прадметам спецыяльнага даследавання. Па-за пэўнымі трапнымі назіраннямі даследчыкаў нельга сказаць, каб мы ведалі з вялікай дакладнасцю, у чым заключаліся асаблівасці дыпламатычнага цырыманіялу ВКЛ, у чым палягалі яго адрозненні ад іншых краін. Безумоўна, вызначэнне гэтых асаблівасцяў і агульных правіл дазволіць лепей зразумець сутнасць знешнепалітычных падыходаў ВКЛ, ажно да больш дэталёвага акрэслення месца і вагі дзяржавы на міжнароднай арэне.

Пасольскі цырыманіял ВКЛ выклікае выключную цікавасць перадусім як феномен не толькі знешнепалітычнай практыкі, але і культуры. У ім назіраецца перапляценне дзвюх асноўных традыцый: заходняй («лацінскай») і ўсходняй («рускай»), з відавочным уплывам таксама татарскіх узораў дыпламатычнай практыкі. З аднаго боку, традыцыя кшталтавалася дзякуючы кантактам з Нямецкім Ордэнам, Польшчай і далей — з заходнееўрапейскімі дзяржавамі. З іншага, глыбокія карані мелі дыпламатычныя правілы і ўзоры, закладзеныя ў культуру кантактаў паміж усходнеславянскімі княствамі яшчэ з часоў існавання Кіеўскай Русі.

Асаблівасці пасольскай цырымоніі ў ВКЛ, стандартных падыходаў да прыёму пасольстваў і ганцоў асабліва добра відаць на кантрасце з пасольскім звычаем Вялікага княства Маскоўскага. Можна запрыкмеціць, што рост палітычнай вагі Масквы прыводзіў да адпаведных змен у дыпламатычным рытуале, пры гэтым гэта датычылася як ідэалагічнага абгрунтавання, так і цырыманіяльных момантаў. Вялікае Княства мусіла рэагаваць на навацыі, што прыводзіла нярэдка да нестандартных рашэнняў і трансфармацый уласнага дыпламатычнага пратаколу.

База крыніц для даследавання з'яўляецца даволі шырокай. Варта выдзяліць маскоўскія пасольскія кнігі, якія адрозніваюцца вельмі дэталёвай і скрупулёзнай інфармацыяй. Пасольскія кнігі ВКЛ не такія змястоўныя, але і яны дазваляюць аднавіць ход і характар дыплыматычных цырымоній даволі дакладна і дэталёва.

З іншых, ужо неафіцыйных крыніц варта згадаць сведчанні дыпламатаў, якія пакідаліся ў эпісталярнай ці літарацкай форме. Асаблівай каштоўнасцю сярод іх вылучаецца «пасольская паэма» Эліяша Пельгрымоўскага. На падставе падрабязнага апісання маскоўскага пасольства, якое наведала Рэч Паспалітую ў 1602 г., можна вельмі дэтальна рэканструяваць працэдуру прыёму дыпламатаў. Твор Пельгрымоўскага адрозніваецца тым, што ён быў дзейным удзельнікам папярэдняга пасольства ў Маскву (1600 г.), дзе выконваў функцыі пісара, які з'яўляўся трэцім членам пасольскай місіі. Мы маем інфармацыю з «першых рук», і не проста назіральніка падзей, а прафесіянала — працаўніка канцылярыі, які непасрэдна выконваў дыпламатычныя задачы. Важныя сведчанні пра нюансы дыпламатычнага цырыманіялу можна знайсці таксама ў творах і запісах іншаземцаў, якія наведвалі Літву.